# БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА, КНІГАЗНАЎСТВА, БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА

УДК 021.4:908(476)]:004.9

*В. І. Саітава, С. В. Зыгмантовіч*

## Сучасныя тэндэнцыі развіцця бібліятэчнага краязнаўства ў лічбавым фармаце: беларускі вопыт

*Раскрываюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця краязнаўчай дзейнасці беларускіх бібліятэк на сучасным этапе. З улікам міжнародных патрабаванняў і вопыту замежных краін апісваюцца працэсы ўключэння новых лічбавых аб'ектаў у сістэму бібліяграфавання, камплексіравання інфармацыі і стварэння разнастайных відаў і жанраў электроннай інфармацыйнай прадукцыі – бібліяграфічных, паўнатэкставых, фактаграфічных, камбінаваных краязнаўчых баз даных, электронных калекцый, бібліятэк і інш. Разглядаюцца перспектыўныя для краязнаўчай дзейнасці бібліятэк кірункі – генеалагічны напрамак, інтэграванне рэсурсаў, выкарыстанне новых форм абслугоўвання карыстальнікаў інфармацыі.*

Бібліятэчнае краязнаўства як галіна бібліятэчнай справы інтэнсіўна развіваецца ў большасці краін свету, выкарыстоўвае назапашаны вопыт, каб выпрацаваць стратэгію краязнаўчай дзейнасці ў новых умовах. Адной з актуальных задач сучаснага дыскурсу з'яўляецца комплекснае асэнсаванне яго фенаменалогіі і дзейнасці.

На сучасным этапе інтэнсіўна і інавацыйна развіваецца практычная краязнаўчая дзейнасць, сфарміравалася адпаведная галіновая навуковая дысцыпліна, краязнаўчая падрыхтоўка вядзецца на ўсіх узроўнях сістэмы прафесійнай адукацыі бібліятэчных кадраў і павышэння кваліфікацыі.

Асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснага бібліятэчнага краязнаўства, найперш практычнай дзейнасці, звязаны з кардынальнымі зменамі ў камунікатыўных працэсах грамадства, з укараненнем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, са змяненнямі прыярытэтаў карыстальнікаў пры выбары крыніц інфармацыі і з ускладненнем сацыяльных задач краязнаўства як грамадскай з'явы.

Цалкам абгрунтавана сцвярджаецца, што стварэнне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў (ІР) і арганізацыя іх выкарыстання для бібліятэк стала адной з прэстыжных задач. Міжнародная федэрацыя бібліятэчных асацыяцый (ІФЛА) у стратэгічных планах секцыі генеалогіі і мясцовай гісторыі ставіць перад бібліятэкамі такія мэты, як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1) садзейнічанне развіццю глабальных сеткавых узаемадзеянняў паміж спецыялістамі па генеалогіі і мясцовай гісторыі, а таксама бібліятэкамі, архівамі і музеямі; 2) падтрымка і развіццё лепшых традыцыйных і электронных генеалагічных матэрыялаў і рэсурсаў па мясцовай гісторыі, актыўная прамоцыя вэб-доступу да лічбавага кантэнту і паслуг, запуск парталаў як інструментаў для сувязі рэсурсаў па генеалогіі і мясцовай гісторыі [18].

Адметнасць і асноўныя тэндэнцыі сучаснага краязнаўства ў цэлым, і бібліятэчнага ў прыватнасці, у кантэксце вызначаных мэт выражаюцца праз надзвычай хуткі рост лічбавага кантэнту; уключэнне новых лічбавых аб'ектаў, разнастайнасць дыгіталізаваных тэкстаў; камплексіраванне розных відаў інфармацыі; павышэнне ролі бібліятэкі ў інтэграванні ІР інстытутаў памяці і іншых грамадскіх устаноў і арганізацый. Гэтыя тэндэнцыі з пэўнай адметнасцю праяўляюцца ў айчынных і замежных бібліятэках, якія назапасілі вопыт дзейнасці ў лічбавым асяроддзі.

Фарміраванне краязнаўчага фонду як адна з галоўных задач бібліятэк ва ўмовах лічбавага асяроддзя істотна змяняецца. Інтэнсіўны характар набыла дыгіталізацыя краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў (краязнаўчых па форме, а нярэдка і па змесце), якая вядзецца бібліятэкамі, архівамі, музеямі, выдавецтвамі, рэдакцыямі мясцовых газет і іншымі арганізацыямі і ўстановамі. Пры гэтым бібліятэкі са сваіх фондаў ці са збораў іншых фондатрымальнікаў алічбоўваюць найбольш каштоўныя і рэдкія краязнаўчыя дакументы (з улікам нарматыўнага рэгулявання) і забяспечваюць доступ да знешніх ІР краязнаўчага характару. Істотная роля належыць нацыянальным бібліятэкам. Яны рэалізуюць праграмы дапамогі публічным бібліятэкам па алічбоўцы мясцовых хронік і іншых дакументаў, якія маюць культурную і гістарычную каштоўнасць для рэгіёнаў. Яркім прыкладам можа быць дзейнасць нацыянальных бібліятэк Кітая і Беларусі (НББ). Падобна шэрагу замежных нацыянальных бібліятэк, у структуры НББ створаны сектар краязнаўства і праектнай работы. НББ ужо выканала некалькі навукова-праектных работ, прысвечаных стварэнню лічбавых копій каштоўных выданняў, сфарміравала з іх відавыя і тэматычныя калекцыі, апублікавала ў асноўным у выглядзе мультымедыйных кампакт-дыскаў, якія бясплатна распаўсюджваюцца ў публічных бібліятэках. Напрыклад, НББ алічбаваны поўныя камплекты памятных кніжак беларускіх губерняў (выдадзены на CD-ROM), каштоўнага дарэвалюцыйнага даведачнага выдання, якое яшчэ нядаўна было ў абласных універсальных бібліятэках (АУБ) у адзінкавых выпусках (напрыклад, у Магілёўскай АУБ было 2 выпускі памятных кніжак Магілёўскай губерні з 35 выпускаў).

Віртуальная чытальная зала як новы электронны сэрвіс НББ прадстаўляе доступ да лепшых краязнаўчых рэсурсаў бібліятэк Беларусі. У будучым прадугледжана ўключэнне дыгіталізаваных краязнаўчых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэкстаў у нацыянальную электронную бібліятэку. Сёння новыя тэхналогіі дазваляюць чытаць асобныя краязнаўчыя кнігі беларускіх аўтараў мінулых стагоддзяў у электронных бібліятэках суседніх краін, як, напрыклад, манаграфіі У. Сыракомлі «Rzeki Niemna od jego zródel do Kowna», Т. Нарбута «Dzieje narodu litewskiego» і іншых у бібліятэцы Polona [26], К. Тышкевіча «Wilija i jej brzegi : pod względem hydrograficznym, historycznym, archeologicznym i etnograficznym» у Падляскай электроннай бібліятэцы [25] і інш.

Для дзейнасці бібліятэк важнае значэнне маюць электронныя краязнаўчыя рэсурсы, якія генерыруюцца архівамі, музеямі, грамадскімі краязнаўчымі арганізацыямі, а таксама і рэгіянальная інфармацыя, якая ствараецца, захоўваецца, адкрываецца для доступу любымі іншымі суб’ектамі: уладнымі, гаспадарчымі, адукацыйнымі. Таму бібліятэкі, найперш дзяржаўныя за мяжой, беларускія абласныя ўніверсальныя і публічныя, ажыццяўляюць экспертны адбор лічбавых аб’ектаў аб краі, стварэнне электронных краязнаўчых калекцый, падрыхтоўку праектаў. Яны генерыруюць БД, рыхтуюць шырокі асартымент бібліяграфічных прадуктаў, арганізуюць работу і насычэнне краязнаўчых сайтаў і парталаў. Нягледзячы на розныя падыходы, якія існуюць у розных краінах, у лічбавай трансфармацыі краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў шмат агульнага. Гэта агульнае праяўляецца ў тым, што ўстойліва пашыраецца відавы склад дыгіталізаваных крыніц краязнаўства і забяспечваецца доступ да іх.

Менавіта гэты шлях выбрала для свайго развіцця айчыннае бібліятэчнае краязнаўства напачатку XXI ст.

Бібліятэкамі ствараюцца паўнатэкставыя БД, якія могуць адлюстроўваць розныя бакі жыцця краю ці мець тэматычны характар, як, напрыклад, «Могилев в печати» Цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк г. Магілёва [12], «Брэсцкі мір» Брэсцкай АБ [2], «Помнікі, памятныя мясціны Кобрынскага раёна» Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы [5].

Электронныя краязнаўчыя калекцыі змяшчаюць лічбавыя копіі каштоўных і рэдкіх выданняў. Яны ствараюцца на аснове агульнасці зместу, прызначэння, тыпу дакументаў, кола карыстальнікаў і інш. Прыкладам электроннай калекцыі з’яўляецца «Витебщина: документальное наследие» [3], якая прадстаўляе лічбавыя копіі каштоўных краязнаўчых дакументаў аб краі XIX – пачатку XX ст. Стварэнне калекцыі стала магчымым дзякуючы алічбоўцы выданняў не толькі абласной, але і Дзяржаўнай публічнай гістарычнай бібліятэкі Расіі.

Электронныя краязнаўчыя бібліятэкі (ЭКБ), якія ўяўляюць упарадкаваныя сукупнасці розных электронных рэсурсаў, забяспечаны сродкамі навігацыі і пошуку з адзіным інтэрфейсам доступу. Атрымалі развіццё за мяжой, напрыклад, ЭКБ «Русский Север» Архангельскай абласной

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навуковай бібліятэкі імя М. А. Дабралюбава [13], бібліятэка Гілдхола (Вялікабрытанія), цалкам спецыялізаваная на гісторыі і сучаснасці Лондана, валодае багатым зборам дакументаў у лічбавым фармаце [19].

З беларускіх бібліятэк вылучаецца Гродзенская АУБ імя Я. Ф. Карскага, у ЭБ якой прадстаўлены калекцыя «Гродзеншчына ў XIX – пачатку XX ст.» з лічбавымі копіямі рэдкіх выданняў на польскай і рускай мовах і БД «Гісторыка-культурныя каштоўнасці Прынёманскага краю» [7].

Сучасны карыстальнік можа атрымаць лічбавыя копіі асобных краязнаўчых выданняў з фондаў бібліятэк. Напрыклад, на сайце Віцебскай АБ у свабодным доступе 5 выпускаў навукова-папулярнага часопіса «Віцебскі сшытак» (1995–2017) [3], на сайце Лагойскай ЦРБ – унікальная кніга «Эта память священна» з матэрыяламі архіўна-пошукавай работы і ўспамінамі аб выратаванні супрацоўнікамі Лагойскай бальніцы 200 цяжкапараненых ваеннаслужачых у гады нямецкай акупацыі [9], на сайце Вілейскай ЦРБ – старонкі з паэтычнай творчасцю зямлячкі Ганны Новік і яе перапіскай [4].

У беларускіх бібліятэках ствараюцца шматлікія фактаграфічныя БД тыпу «Хроніка краю» і «Краязнаўчы каляндар», тэматычныя і біяграфічныя, напрыклад, «Дзеячы краю», «Помнікі і памятныя мясціны краю», «Вуліцы населенага пункта» і інш. Магілёўская АБ стварыла БД, прысвечаную пісьменнікам-землякам «Таленты ад роднай зямлі» [11].

Варта адзначыць, што важны ўклад у падрыхтоўку БД уносяць сельскія бібліятэкі, многія з якіх падрыхтавалі летапісы вёсак – вынік карпатлівай пошукава-даследчай работы ў архівах, музеях, з мясцовым насельніцтвам. Але стварэнне баз даных у сельскіх бібліятэках ідзе больш марудна з-за адсутнасці адміністрацыйнай і фінансавай падтрымкі.

Сярод буйных краязнаўчых рэсурсаў бібліятэк – камбінаваныя БД, у якіх камплексіруецца паўнатэкставая, фактаграфічная, бібліяграфічная, выяўленчая інфармацыя. Прыкладам такіх рэсурсаў з'яўляюцца «Край мой, Магілёўшчына» Магілёўскай АБ [11], «Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць» Віцебскай АБ [3]. Яны змяшчаюць старанна адабраны і структураваны ўніверсальны кантэнт, забяспечаны зручнымі пошукава-навігацыйнымі інструментамі.

Асобныя бібліятэкі ствараюць такія папулярныя ў літаратурным краязнаўстве рэсурсы, як літаратурныя карты рэгіёнаў, віртуальныя літаратурныя падарожжы і літаратурныя музеі. Тым не менш, у параўнанні з расійскімі бібліятэкамі, якія працуюць па агульнадзяржаўным праекце «Литературная карта России», што забяспечвае высокую якасць створанай інфармацыйнай прадукцыі, айчынныя ЭІР Гомельскай АБ, ДУ «Сетка публічных бібліятэк г. Гомеля» і іншыя больш сціплыя паводле кантэнту і магчымасцей навігацыі і пошуку.

Дыгіталізацыя выданняў і тэкстаў сёння пашырыла кола даступных крыніц, што ўмацоўвае ролю айчынных бібліятэк не толькі ў асветніцкай,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

а і ў забеспячэнні краязнаўчай навукова-даследчай  дзейнасці. У гэтым аспекце актуальным для бібліятэк з'яўляецца развіццё алічбоўкі такіх крыніц краязнаўства, як рэгіянальная прэса, гістарычныя карты, фотадакументы, комплекс архіўных матэрыялаў для ўзнаўлення радаводаў і даследаванняў сямейнай гісторыі і развіццё доступу да такога роду адкрытых рэсурсаў у Інтэрнэце.

Лічбавыя архівы мясцовых газет надзвычай важныя для вывучэння гісторыі краю і лёсаў яго жыхароў і папулярныя сярод карыстальнікаў свету. Напрыклад, гістарычны вэб-сайт газеты «Fulton History» мае звыш 6 млн праглядаў у месяц [20]. Ёсць пэўныя дасягненні і ў алічбоўцы беларускіх газет. Так, НББ алічбоўвае газету «Звязда» за 100 год, газеты 1917–1922 гг. выпуску, фарміруе Электронны архіў нацыянальнай перыёдыкі, які ахоплівае новыя выпускі перыядычных выданняў, у т. л. рэгіянальных, а таксама паведамленні інфармацыйных агенцтваў БЕЛТА і «Интерфакс», але доступ магчымы толькі карыстальнікам у НББ і капіраванне матэрыялаў забаронена [10]. Новыя выпускі газет рэгіянальнага ўзроўню зараз даступныя праз іх інфармацыйныя парталы, але, на жаль, гэтага не «бачаць» наведвальнікі большасці бібліятэчных сайтаў. Сярод рэдкіх выключэнняў спасылкі на сайты раённых газет падаюць Шумілінская і Бераставіцкая цэнтральныя раённыя бібліятэкі.

Адным з важных кірункаў для краязнаўчых даследаванняў з'яўляецца алічбоўка гістарычных карт. Так, «Карты ХХ ст. Лондана», якія належаць Брытанскай бібліятэцы [23], зручныя ў выкарыстанні для даследчыкаў, студэнтаў, таму што суправаджаюцца метадычнымі, змястоўнымі анатацыямі, спасылкамі на знешнія рэсурсы і іншай дадатковай інфармацыяй, а інтэрактыўныя геаграфічныя інструменты дазваляюць суадносіць аб'екты на гістарычных і сучасных картах.

Варта звярнуць увагу на ўнікальныя зборы фатаграфій, якія захоўваюцца ў бібліятэках. Гэтыя рэсурсы добра ўпарадкаваны, апісаны і забяспечаны зручным пошукам. Напрыклад, фонд Бібліятэкі і архіва Канады змяшчае звыш 25 млн фатаграфій. Дыгіталізацыя фонду была распачата па ініцыятыве цэнтра генеалогіі бібліятэкі (найбольшым попытам карысталася інфармацыя аб продках, месцах іх пражывання). Даследчыкі падкрэсліваюць значэнне гістарычных фатаграфій для рэстаўрацыі будынкаў, атрымання звестак аб стратах рэгіянальнай культурнай спадчыны, аб змяненні прыродных ландшафтаў.

У фондах бібліятэк Беларусі таксама захоўваюцца фатаграфіі з розных гістарычных перыядаў, якія дапамагаюць ствараць новыя бібліятэчна-інфармацыйныя прадукты і праекты. Так, Вілейская ЦРБ імя Г. Новік падрыхтавала выставу «Малая радзіма на старых фотаздымках» [4]. Дарэчы, далейшая мэтанакіраваная праца з мясцовым насельніцтвам дазволіць значна ўзбагаціць зборы фатаграфій, упарадкаваць работу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з арыгіналамі фотаздымкаў, іх апісаннем (бібліяграфічным і навуковым архіўным). У дасягненні сучаснага ўзроўню дзейнасці з фотадакументамі вядучая роля адводзіцца НББ. Нацыянальная бібліятэка распачала працу над праектам па стварэнні лічбавага рэсурсу ўнікальных і каштоўных фатаграфій мінулага па ўсіх магчымых кірунках краязнаўства.

У рэчышчы міжнародных патрабаванняў актуальным для беларускіх бібліятэк становіцца генеалагічны напрамак. У замежным краязнаўстве ён вядзецца ў спецыялізаваных структурных падраздзяленнях супрацоўнікамі бібліятэк у цесных стасунках з мясцовымі генеалогамі. Адзначым, што выдатна распрацаваныя вэб-сайты генеалогіі ці раздзелы генеалогіі ў Бібліятэцы і архіве Канады [17], Нью-Ёркскай публічнай бібліятэцы [16], публічных бібліятэках г. Цынцынаці (ЗША) [14], г. Лондан (Канада) [15; 21; 22; 24].

Генеалагічны напрамак становіцца ўсё больш актуальным у бібліятэках Расіі. Пачалося навучанне бібліятэкараў практычным уменням выкарыстання разнастайных рэсурсаў і камп'ютарных генеалагічных праграм, напрыклад, семінары «Школа краязнаўчай генеалогіі» [8].

Нягледзячы на дамінуючую ролю архіваў і музеяў, перспектыўны генеалагічны кірунак адзначаны і ў краязнаўчай рабоце беларускіх бібліятэк. Наяўныя лічбавыя і традыцыйныя рэсурсы прыстасаваны для пошуку звестак аб асобных персонах: пераважна выдатных земляках, дзеячах розных сфер. Але адшукаць звесткі аб сям'і, прасачыць сувязі паміж пакаленнямі, – гэта значна больш складаная задача (яна звычайна вырашаецца ў архівах). Беларускімі бібліятэкарамі назапашаны вопыт распрацоўкі праектаў, якія ўзнаўляюць радаводы, знакавыя для пэўнай мясцовасці. Так, ЦГБ г. Жодзіна разам з Мінскім абласным архівам правялі вялікую работу па выяўленні частотных прозвішчаў і яго першых пасяленцаў.

Улічваючы хуткі рост лічбавага краязнаўчага кантэнту, варыятыўнасць форм яго прадстаўлення, кірункі далейшага развіцця, неабходна звярнуць увагу на інтэгруючую ролю бібліятэк у прадстаўленні краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў не толькі ў змястоўным, сацыяльна-культурным, але і ў тэхналагічным аспекце (рэалізуецца праз краязнаўчыя бібліяграфічныя сістэмы – каталогі, БД і іншыя, якія адлюстроўваюць традыцыйныя, лічбавыя і інтэрнэт-рэсурсы.).

Бібліятэкі ствараюць навігатары па анлайн-рэсурсах, якія даюць спасылкі да сайтаў выканкамаў і некаторых іншых рэсурсаў. Так, Міёрская ЦРБ прапануе наведвальнікам звярнуцца да ЭІР Віцебскай АБ і рэсурсаў уласнай генерацыі: «Прыдзвінскі край: Міёры», «Вядомыя ўраджэнцы краю», «Афганистан: без права на забвение» і да электроннага архіва «Мемориал» Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі [6]. Трэба адзначыць, што для краязнаўчай работы бібліятэк карыснымі былі б спасылкі да навукова-даведачнага апарату Нацыянальнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычнага архіва Беларусі, да БД НАРБ «Белорусские деревни, сожженные в годы Великой Отечественной войны» і інш.

Інтэграванню краязнаўчых рэсурсаў і аптымізацыі доступу да іх спрыяе выкарыстанне свабоднага праграмнага забеспячэння тыпу Calameo, QR код, сэрвісаў Discovery, ліцэнзій Creative Commons, прафесіянальных міжнародных і нацыянальных стандартаў, пашырэнне прынцыпу краўдсорсінгу, прамоцыя краязнаўчага кантэнту праз сайты і парталы, стужкі навін, сацыяльныя сеткі. Сярод бібліятэк, якія дасягнулі значных вынікаў у выкарыстанні сучасных тэхналогій, вылучаецца Барысаўская ЦРБ імя І. Х. Каладзеева (за год колькасць наведвальнікаў сайта перавысіла 200 тысяч чалавек, у тым ліку з Расіі, Украіны, ЗША, Бразіліі, Канады і Польшчы) [1]. Відавочна, што замежных карыстальнікаў прываблівае краязнаўчы кантэнт.

Такім чынам, ускладненне асартыменту краязнаўчых інфармацыйных прадуктаў за кошт засваення іх новых відаў і жанраў дае магчымасць бібліятэкам развіваць і новыя формы абслугоўвання карыстальнікаў (віртуальнае абслугоўванне, кансультаванне анлайн, электронная дастаўка дакументаў, анлайн-сэрвісы); ажыццяўляць распаўсюджванне краязнаўчых ведаў праз тэлеканферэнцыі, разнастайныя мультымедыйныя прадукты – буктрэйлеры, відэаролікі, віктарыны і інш.; падтрымліваць камунікатыўныя сувязі з карыстальнікамі праз форумы, блогі і інш. Адной з ключавых праблем вартаснага, годнага, адпаведнага сусветным патрабаванням развіцця краязнаўчай дзейнасці бібліятэк Беларусі з’яўляецца рост патрабаванняў да кампетэнцый бібліятэкараў-бібліёграфаў, краязнаўцаў. На наш погляд, гэтаму б спрыяла спецыялізаваная падрыхтоўка студэнтаў у БДУКМ і ўвядзенне прафілізацыі «бібліятэкар-краязнавец» пры распрацоўцы новага адукацыйнага стандарту 3+.

*1.* Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.borlib.by. – Дата доступу: 10.09.2018.

*2.* Брестская областная библиотека им. М. Горького [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://brl.by/#. – Дата доступа: 08.09.2018.

*3.* ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://vlib.by/index.php/ru. – Дата доступу: 10.09.2018.

*4.* ГУК «Вилейская централизованная библиотечная система» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://villib.by/index.php/category/ganna-novik/. – Дата доступа: 12.09.2018.

*5.* ГУК «Кобринская централизованная библиотечная система» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://krcls.by/. – Дата доступа: 08.09.2018.

*6.* ГУК «Миорская библиотечная централизованная система» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://miory-biblioteka.by. –Дата доступа: 10.09.2018.

*7.* ДУК «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://grodnolib.by/. – Дата доступу: 13.09.2018.

*8.* Краеведение для профессионалов [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://book.uraic.ru/news_topic/2017/02/3375. – Дата доступа: 08.09.2018.

*9.* Логойская центральная районная библиотека [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://logoysklib.belcult.by/. – Дата доступа: 17.09.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10.* Нацыянальная бібліятэка Беларусі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.nlb.by. – Дата доступу: 21.09.2018.

*11.* УК «Могилевская областная библиотека им. В. И. Ленина» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://library.mogilev.by/. – Дата доступа: 14.09.2018.

*12.* УК «Централизованная система государственных публичных библиотек г. Могилева» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://csgpb.mogilev.by/biblioteka/. – Дата доступа: 15.09.2018.

*13.* Электронная краеведческая библиотека «Русский Север» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ekb.aonb.ru/. – Дата доступа: 23.09.2018.

*14.* Genealogy [Electronic resource] // The Public Library of Cincinnati and Hamilton County. – Mode of access: https://www.cincinnatilibrary.org/resources/research.asp?group=10. – Date of access: 12.09.2018.

*15.* Genealogy [Electronic resource] // London Public Library. – Mode of access: http://www.londonpubliclibrary.ca/research/genealogy. – Date of access: 17.09.2018.

*16.* Genealogy [Electronic resource] // The New York Public Library. – Mode of access: https://www.nypl.org/weblinks/genealogy. – Date of access: 18.09.2018.

*17.* Genealogy and Family History [Electronic resource] // Library and Archives Canada. – Mode of access: http://www.bac-lac.gc.ca/eng/Pages/home.aspx. – Date of access: 19.09.2018.

*18.* Genealogy and Local History: Section Strategic Plan [Electronic resource] // IFLA. – Mode of access: https://www.ifla.org/publications/genealogy-and-local-history-section-strategic-plan?og=78. – Date of access: 17.09.2018.

*19.* Guildhall Library [Electronic resource] // City of London. – Mode of access: https://www.cityoflondon.gov.uk/things-to-do/guildhall-library/Pages/default.aspx. – Date of access: 09.09.2018.

*20.* Fulton History [Electronic resource] // To Old Fulton New York Post Cards. – Mode of access: http://fultonhistory.com. – Date of access: 22.09.2018.

*21.* Local History // London Public Library [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.londonpubliclibrary.ca/research/local-history. – Date of access: 22.09.2018.

*22.* Local History [Electronic resource] // Toronto Public Library. – Mode of access: https: www.torontopubliclibrary.ca. – Date of access: 12.09.2018.

*23.* London: A Life in Maps [Electronic resource] // Online Gallery. – Mode of access: http://www.bl.uk/londoninmaps. – Date of access: 24.09.2018.

*24.* London Public Library [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.londonpubliclibrary.ca/. – Date of access: 20.09.2018.

*25.* Podlaska Digital Library [Electronic resource]. – Mode of access:http://pbc.biaman.pl/dlibra. – Date of access: 23.09.2018.

*26.* Polona [Electronic resource]. – Mode of access: https://polona.pl/. – Date of access: 23.09.2018.

*V. Saitava, S. Zygmantovich*

**Modern trends in the development of library ethnography activity in digital format: the Belarusian experience**

*Main trends in the development of the ethnography activity of the Belarusian libraries at the present stage are revealed. Taking into account international requirements and experience of foreign countries the processes of inclusion of new digital objects into the bibliographic system, information combining and creation of a variety of types and genres of electronic information products (bibliographic, full-text, factual, multiple regional databases, electronic collections, libraries, etc.) are described. Perspective directions for libraries' ethnography activity (genealogical direction, integration of resources, the use of new forms of information users' service) are considered.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 19.10.2018.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ